Падтрымай "Вясну" на PATREON

За жартоўную дыскусію ў тэлеграм-каналах - восем год і адзін месяц калоніі дапоўнена

15.03.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Іван Вярбіцкі. Фота: "Рэгіянальная газета"

У судзе Смаргонскага раёна 15 сакавіка вынесены прысуд па крымінальнай справе, заведзенай на жыхара Гальшанаў Івана Вярбіцкага.

Яго абвінавацілі адразу па некалькіх сур'ёзных артыкулах: падбухторванне да акта тэрарызму, незаконныя набыццё, захоўванне боепрыпасаў і выбуховых рэчываў, а таксама знішчэнне афіцыйных дакументаў.

Справу разглядае суддзя **Людміла Пятрова**, дзяржаўны абвінаваўца – пракурор **Сяргей Кавальчук.**

Як паведамляла пракуратура Ашмянскага раёна, згодна з матэрыяламі справы 14 кастрычніка 2020 года ў мэтах дэстабілізацыі грамадскага парадку грамадзянін размясціў у адной з груп Telegram-канала тэкставыя паведамленні, у якіх утрымліваліся заклікі да пашкоджання «кактэйлямі Молатава» будынка КДБ і падпалу пракуратуры Ашмянскага раёна.

У гэты ж дзень і ў тым жа Telegram-чаце пад нікам «Dimon D» ён размясціў паведамленне з заклікамі да пашкоджання і знішчэння маёмасці супрацоўнікаў праваахоўных органаў шляхам падпалу транспартных сродкаў, якія належаць ім.



«Заўтра ідзём штурмаваць мясцовы КДБ». У Смаргоні пачаўся суд над гальшанскім "тэрарыстам"

Пасля вывучэння матэрыялаў крымінальнай справы ў пракуратуры Ашмянскага раёна прыйшлі да высновы аб абгрунтаванасці абвінавачвання, поўным і аб'ектыўным даследаванні абставінаў злачынстваў, пагадзіліся з прававой кваліфікацыяй зробленага паводле ч. 5 арт. 16 і ч. 2 арт. 289, ч. 1 арт. 377, ч. 2 арт. 295 Крымінальнага кодэкса.

15 сакавіка з апошнім словам выступіў Іван Вярбіцкі. Ён прызнаў віну толькі у пашкоджанні пастановы на вобшук.

Таксама прапанаваў суду ўзбудзіць у сваю чаргу крымінальную справу супраць дзяржаўнага абвінаваўцы Сяргея Кавальчука.

Пракурор прасіў дзевяць з паловай гадоў калоніі

Вырак суда: за падбухторванне да акта тэрарызму (частка 1 артыкула 289 КК)- 8 гадоў калоніі;

за знішчэнне пастановы на ператрус (частка 1 артыкула 377 КК) - 2 месяцы калоніі,

Па артыкуле 295 КК (Незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў) - апраўданы.

Канчатковае пакаранне - **8 гадоў і 1 месяц калоніі ўзмоцненага рэжыму.**

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сыст

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў

рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY